■ Не з пустымі рукамі

# «Каб падарунку быў я рады, у бацькоў спытай парады!»

## ШТО НЕЛЬГА ДАРЫЦЬ ДЗЕЦЯМ?



**Падарункі — гэта заўсёды прыемна. І дзеці іх з нецярпеннем чакаюць, таму трэба, каб чаканне апраўдалася — прэзент спадабаўся. Але не менш важна, каб падораным рэчам былі рады і бацькі, бо малыя яшчэ дакладна не ведаюць, што сапраўды будзе для іх карысна, а што — небяспечна.**

Калі нарадзіўся Даня, да нас па чарзе пачалі прыходзіць сваякі, каб наведаць немаўля. Зразумела, усе прынесілі падарункі. Што тут пачалося! Паўзункі, бодзі, распашонкі, гарнітурчыкі, піжамкі, шапачкі, калготкі, камбінезон з курткай на зіму і яшчэ міжсезонны — усё ў такой колькасці, што аднаму не знасіць. Здаецца, можна было б узрадавацца, бо нічога купляць не прыйдзецца. Але, па-першае, адны рэчы былі «на вырост», і калі прыйшоў час іх насіць, яны не падышлі па сезоне. Іншыя аказаліся з сінтэтычнага матэрыялу, што не вельмі добра для малога. Трэція былі непрыгожымі, на мой густ, і нават не хацелася іх апранаць. Па-другое, як мне здаецца, любой маці, тым больш калі нараджаецца першынец, хочацца самой выбіраць дзіцячае адзенне.

Акрамя адзення, пасля гасцей засталася яшчэ цэлая скрынка разнастайных бразготак, мяккіх мядзведзікаў і зайчыкаў.

Напэўна, у адпаведнай сітуацыі былі многія бацькі. І здаецца, першы раз можна на гэта не звяртаць увагі. Але калі на кожнае свята ваша дзіця будзе атрымліваць шмат непатрэбных рэчаў, то гэта пачне раздражняць. Таму тым, хто чарговы раз збіраецца ашчасліваць дзіця падарункам, лепш дакладна ведаць, што дарыць **нельга**. Запамінайце:

**1. Кітайскі «шырспажыў».** Звычайна гэта танныя, ломкія цацкі са з'едлівым пахам пластмасы. У нашага сына яны звычайна не «пражываюць» і гадзіны, але іх часта купляюць, каб нешта даць малому ў ручкі. У такім выпадку лепш прынесці дзіцяці вязанку надзіманых шароў. Малы будзе ў захапленні.

**2. Канструктар з дробнымі дэталямі.** Некаторым бацькам не падабаюцца такія цацкі, бо дзеці раскідваюць іх паўсюль, і ўсе раз-пораз на іх натыкаюцца. Аднак у абарону «дробнага» канструктара трэба сказаць, што ён добра развівае маторыку, фантазію, мысленне. Таму карысці ад яго ўсё ж больш. Выйсце ёсць! Напрыклад, я прывучыла сына гуляць з маленькімі дэталямі ў адным месцы, а не насіць па ўсім доме. Да таго ж канструктар мы захоўваем у скрынцы з невялікімі борцікамі. Малому зручна гуляць у ёй (не трэба высыпаць на падлогу ўвесь канструктар), і дэталі не раскідваюцца.

**3. Занадта шумныя цацкі.** Дзеці іх любяць, а дарослыя хутка стамляюцца ад павышанага ўзроўню шуму. Нам аднойчы падарылі матацыкл, які роў амаль як сапраўдны. Каб уключыць, трэба было выняць спецыяльную пласцінку, а каб выключыць — уставіць назад. Так сталася, што пласцінка згубілася, і мы нічога не маглі зрабіць, каб гэты «байк» замаўчаў. Потым уставілі палоску кардону так далёка, каб выняць яе ўжо было немагчыма.

Усе танкі, аўтаматы, якія мільгацяць або выдаюць рэзкія гукі, — занадта агрэсіўныя для дзіцячай псіхікі. А зусім малых могуць напалохаць. Напрыклад, наш Даня, калі яму быў годзік, расплакаўся, пачуўшы, як прыгожы ружовы мядзведзік заспяваў вясёлую дзіцячую песню.

**4. Забаўкі не па ўзросце.** Асабліва сумна, калі гэта яшчэ і добрыя, якасныя цацкі. Хросны бацька нашага сына на два гады падарыў яму машыну з пультам кіравання. Зразумела, што ў гэтым узросце малы не разумеў, як ёю кіраваць, і наўгад ціснуў на рычаг. Ад падарунка не толькі не было карысці, але і псаваліся вуглы мэблі, калі машына ўразалася ў іх на вялікай хуткасці. Выйсце было адно: схаваць забаву да лепшых часоў, што я і зрабіла.

Недарэмна на цацках указаны ўзрост дзіцяці. Арыентуйцеся на гэта пры выбары рэчаў. І тады малы сапраўды атрымае максімум карысці.

**5. Адзенне.** Няякаснае, вельмі яркіх колераў, з сінтэтычных матэрыялаў — нікому не даспадобы. Лепш не рызыкуйце, бо можаце не ўгадаць з памерам, і кофтачка акажацца маленькай. Занадта навырост таксама нельга купляць, вопратку — бацькі пакладуць на паліцу і могуць пра яе забыць. Да таго ж, мама часта падбірае адзенне па стылі, колеры, а вы не ведаеце яе густ.

**Калі на кожнае свята, хай то дзень нараджэння ці Новы год, ваша дзіця будзе атрымліваць вялікую колькасць непатрэбных рэчаў, то гэта пачне раздражняць.**

Бабуля падарыла Даню сінюю піжаму ў выглядзе касцюма «чалавека-павука», да таго ж яна была пухнатая і поўнасцю з акрылу. Рэч доўгі час праляжала ў шафе. Сёння Даня часам просіць надзець яе, калі мы ў вёсцы распальваем вогнішча або ходзім у лес.

**6. Прэзенты, да якіх трэба дадаткова нешта купляць.** Напрыклад, аўтадром «Шчанячы патруль» не будзе радаваць малога, пакуль бацькі не купяць усіх герояў з адпаведнага мульціка. А каштуюць яны дорага.

На 3 гады Даню падарылі паравоз. Ён выглядаў, як паменшаная копія сапраўднага, ездзіў па вялікай чыгунцы, пыхкаў, а з трубы ішла пара. Сын, зразумела, быў вельмі ўражаны. Але батарэек хапіла ўсяго на адзін вечар, а каштавалі яны зусім не танна (патрэбны былі спецыяльныя, вялікіх памераў). Карацей, цацка аказалася дарагой.

**7. Небяспечныя шабля, меч, нож, пісталет** таксама выклікаюць крытыку бацькоў. Гуляючы з імі, дзеці могуць параніцца або сапсаваць нешта. А гэта можа пакінуць негатыўныя ўражанні ад падарунка.

**8. Мяккая цацка вялікіх памераў.** Сучасных дзяцей гэтыя «грамілы» ўвогуле мала цікавяць, да таго ж двухметровы заяц зойме занадта шмат месца ў кватэры, а з гадамі ператворыцца ў вялікі пылазборнік. Дарэмная трата грошай.

**9. Салодкі падарунак.** Калі малы бачыць вялікую колькасць цукерак у прыгожых абгортках, для яго гэта значыць толькі адно — ён можа іх з'есці. Калі не за раз, то за два.



Самае бяспечнае, чым усё можа скончыцца, — дыятэз. Да таго ж мама, зразумела, паспрабуе адабраць гэтую спакусу, і малы ўзніме крык — настрой будзе сапсаваны. Каб пазбегнуць такой сітуацыі, запомніце агульнае правіла: усё, што можна з'есці, трэба аддаць не дзіцяці, а бацькам, бо яны лепш ведаюць, што можна малому, а што — не, і калі лепш даць яму паласавацца. Зразумела, аддаваць прысмакі трэба не пры дзіцяці.

**10. Грошы.** Дарыць іх могуць хіба што бацькі або бабулі-дзядулі. Многія дарослыя ўвогуле супраць, каб у дзяцей былі грошы, бо тыя не змогуць імі правільна распарадзіцца. Калі грошы вы аддасце бацькам (маўляў, няхай купяць, што трэба), то дзіця адчуе, што ўвогуле не атрымала ніякага падарунка. У такім разе трэба нечым парадаваць і малога — уручыце яму цікавую кніжку з добрымі ілюстрацыямі.

І нарэшце, калі вы хочаце, каб падарунак сапраўды спадабаўся, лепш парайцеся з бацькамі. Яны падкажуць, аб чым дзіця марыць, чым захапляецца, ад чаго будзе пад вялікім уражаннем.

Яна ЛЫЧКОЎСКАЯ ■

■ Творчы эксперымент

# НОВЫ ГОД — НААДВАРОТ,

## або Як незвычайна сустрэць свята?

**Новы год у кожнага з нас атаясамліваецца з вялікай колькасцю традыцый: упрыгожыць ёлку і кватэру, падрыхтаваць прыемныя падарункі і паштоўкі, накрыць стол з любімымі стравамі, выпіць пеністага шампанскага, загадаць жаданне пад бой курантаў... Нягледзячы на тое, што ўсё, здаецца, звыкла і прадказальна, многія людзі ў глыбіні душы па-ранейшаму вераць у маленькае дзіва і спадзяюцца, што навагодняя ноч будзе незвычайнай, поўнай сюрпрызаў. Калі і вы з іх ліку, прапануем крышачку адысці ад агульнапрынятых рытуалаў і паглядзець, што з гэтага атрымаецца. Давайце адзначым Новы год — наадварот, бо правілы існуюць, каб іх парушаць!**



✓ Вы заўсёды лічылі, што Новы год — сямейнае свята і прывыклі да хатніх пасядзелак? Адпраўляйцеся ў госці, закажыце стол у кафэ або рэстаране, калі ёсць хатка ў вёсцы — спраўляйце свята там. А можна ўвогуле радыкальна падысці да пытання: адправіцца ў навагодні тур па Еўропе або на гарналыжны курорт. Хочацца экзотыкі — забраніруйце нумар у гістарычным месцы: Мірскім або Нясвіжскім замку, рэзідэнцыі Дзеда Мароза ў Белавежскай пушчы — там вас чакае чароўная атмасфера.

**У Румыніі абавязковай стравай лічыцца пірог, у якім «схаваны» манета, арэх або пярчынка. Знаходка абяцае ўладальніку ў будучым годзе стварыць сям'ю.**

Калі, наадварот, звычайна на Новы год вы пакідалі родны дом, то прыйшоў час зладзіць хатнюю вечарынку і паклікаць гасцей да сябе.

✓ У вашым доме прынята ставіць жывую лясную прыгажуню? На гэты раз зрабіце ялінку сваімі рукамі ў выглядзе конуса і упрыгожце самаробнымі цацкамі, шышкамі, цукеркамі. Можаце стварыць сілуэт ёлкі на сцяне і прымацаваць да яго шаўковыя банцікі, рознакаляровыя зорачкі і бялюткія сняжынкі.

✓ Адмоўцеся ад усіх традыцыйных салатаў і гарачых закусак. Самы час пакаштаваць нешта новае і арыгінальнае. Скарыстайцеся рэцэптамі страў іншых краін свету. Напрыклад, у Англіі традыцыйна на святочны стол ставяць індычку, фаршыраваную гароднінай. А ў Румыніі абавязковай стравай лічыцца пірог, у якім «схаваны» манета, арэх або пярчынка. Знаходка абяцае ўладальніку ў будучым годзе стварыць сям'ю. Навучыцеся гатаваць тое, што даўно планавалі. Замест традыцыйнага шампанскага зрабіце свае кактэйлі.

✓ Дзед Мароз і Снягурка заўсёды радуюць сваім з'яўленнем. Толькі на гэты раз запрасіце да сябе Снежную Каралеву і Снегавіка (можна каму-небудзь пераапрануцца). Гэтыя казачныя героі абавязкова спадабаюцца гасцям.

✓ Звычайна навагоднюю праграму рыхтуюць дарослыя для дзяцей. А можа, прыйшоў час зладзіць ранішнік для дарослых? Папрасіце дзяцей (калі яны не зусім маленькія, вядома) падрыхтаваць забавы для мамы, таты, бабулі і дзядулі, а тыя няхай безадказна выконваюць усе самыя дзівацкія задумкі. Прапануйце пагуляць у «кракадзіла». Загадзя прыдумайце цікавыя словазлучэнні, напрыклад «ёлка, якая загарэлася», «надакучлівыя госці», «стомленая Снягурка». І не забудзьцеся пра маскарадныя касцюмы. Напэўна, такая забава прыйдзецца ўсім па душы.

✓ Як правіла, у навагоднюю ноч не сціхаюць залпы салютаў і петард. Адыдзіце ад правіла і запусціце ў неба паветраныя шары або нябесныя ліхтарыкі.

✓ Што ўсе робяць без пяці хвілін да 12? Правільна, слухаюць віншаванне Прэзідэнта. А вы запішыце ўласнае віншаванне для сям'і і сябровў і ўключыце ў патрэбны момант. Вось будзе нечаканасць!

✓ Самы прыемны момант для дзяцей, вядома, раскрываць падарункі. Цікавая ідэя — прапанаваць малым гульню-квэст. Схавайце падарункі недзе ў кватэры і зрабіце карту з загадкамі. Няхай пошук «навагодняга скарбу» стане сапраўдны прыгодай!

Наталля ЛЕАНОВІЧ ■